База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# КЛІКАЛА СЛОВА Ў БОЙ

Біяграфія Рыгора Мацвеевіча Галавацкага — гэта па сутнасці біяграфія нашай савецкай Айчыны. Бацькі яго былі сялянамі, вельмі любілі зямлю. Любіў яе і сын. У дваццаць гадоў, пасля заканчэння Мінскай раённай калгаснай школы, ён выбіраецца старшынёй калгаса. У 1936 годзе прызываецца ў армію, дзе уступае ў партыю, заканчвае акруговыя курсы малодшых палітрукоў і становіцца прафесіянальным палітработнікам Чырвонай Арміі.

Ў пачатку лістапада сорак трэцяга года 22-я артылерыйская дывізія прарыву Рэзерва Вярхрўнага Галоўнакамандуючага пачала вызваленне нашай вобласці. У саставе гэтай дывізіі адным з першых у яе межы ўступіў намеснік камандзіра 316-га артылерыйскага палка па палітычнай частцы гвардыі маёр Рыгор Мацвеевіч Галавацкі. Яму, ураджэнцу вёскі Кубічы, што ў Мінскім раёне, давялося пачудь нямала віншаванняў ад байцоў і камандзіраў палка з пачаткам вызвалення беларускай зямлі ад фашысцкіх захопнікаў.

Гвардыі маёр Галавацкі ўвесь час знаходзіўся на перадавой.

— Рыгор Мацвеевіч быў адным з лепшых палітработнікаў дывізіі, — расказваў летась у час сустрэчы з гамяльчанамі былы начальнік паліт-аддзела 22-й Гомельскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава, Кутузава і Багдана Хмяільніцкага артылерыйскай дывізіі прарыву РВГК палкоўнік у адстаўцы Н. С. Веніямінаў. Ён умеў выбраць час для палітінфармацыі, і для гутаркі. Калі ж абстаноўка не дазваляла, прабіраўся да гармат, прыносіў разлікам апошнія весткі, растлумачваў загад камандзіра палка, паведамляў пра подзвігі савецкіх воінаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны, пра зверствы фашыстаў на савецкай зямлі. Ён знаходзіў і час пагутарыць з кожным, паслаць пісьмы-расказы пра лепшых воінаў іх родным і блізкім. Байцы і камандзіры любілі Галавацкага. Гаварылі пра яго: наш камісар.

У баях за Гомель быў цяжка паранены камандзір палка гіадпалкоўнік В. Вішнявецкі. Гвардыі маёр Галавацкі ўзяў камандаванне палком на сябе. На світанку 12 снежня, рыхтуючыся да контратакі на паўночны захад ад Гомеля, гітлераўцы пачалі ўзмоцнены артылерыйскі абстрэл на ўчастку палка. Галавацкі быў хворы, урачы прапанавалі яму пайсці ў медсанбат. «Біць ворага трэба, а не адлежвацца ў медсанбаце», — адказаў ён. І застаўся ў страі, кіраваў агнявым боем палка. У гэтым баі варожы снарад, што разарваўся побач, абарваў жыццё адважнага палітработніка. Сябрыаднапалчане пахавалі Рыгора Мацвеевіча ў вызваленым Гомелі.

Гамяльчане свята ўшаноўваюць памяць гвардыі маёра Рыгора Мацвеевіча Галавацкага. Рашэннем гарвыканкома Старапрудкоўская вуліца ў Цэнтральным раёне перайменавана ў вуліцу Р. М. Галавацкага. На доме № 1 устаноўлена мемарыяльная дошка: «Вуліца названа імем намесніка камандзіра артылерыйскага: палка гвардыі маёра Галавацкага Рыгора Мацвеевіча (1914-1943 гг.), які загінуў у баях за вызваленне Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

**Ф. СТЭЛЬМАШОК, падпалкоўнік у адстаўцы.**